УДК 619:616.2:636.32/.38.053
**ХАХЛЯНОК Г.Ю., ПАЗНЯК П.С.,** студэнты; **НУРГАЛІЕЎ ТУРГАЛІ, САРГЕНГАЛІ УЛІ,** магістранты
Навуковыя кіраўнікі – **Пятроўскі С.У.,** канд. вет. навук, дацэнт; **Васькін В.М.,** асістэнт
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# ЗМЯНЕННІ ЎТРЫМАННЯ Ў КРЫВІ ЯГНЯТАК ЭРЫТРАЦЫТАЎ, ЛЕЙКАЦЫТАЎ І ГЕМАГЛАБІНУ ПРЫ РЭСПІРАТОРНЫХ ХВАРОБАХ

**Уводзіны.** Хваробы органаў дыхання (рэспіраторныя хваробы) досыць часта рэгіструюцца ў маладняку авечак у розных краінах свету і чыняць значную эканамічную шкоду [1, 2]. Важным этыялагічным фактарам пры дадзеных хваробах выступаюць розныя мікраарганізмы [2-4]. У сувязі з гэтым вядучым сродкам этыятропнай тэрапіі робяццца розныя антымікробныя прэпараты. Аднак іх ужыванне не заўсёды дазваляе забяспечыць поўнае акрыянне жывёлы і ўзнаўленні яго гаспадарчай каштоўнасці.

У сувязі з гэтым мэтай нашых доследаў стаў пошук шляхоў павышэння эфектыўнасці лячэбных мерапрыемстваў пры запаленчых рэспіраторных хваробах ягнятак на падставе ацэнкі змяненняў шэрагу паказчыкаў крыві.

**Матэрыялы і метады даследванняў.** Ва ўмовах фермерскай гаспадаркі (Рэспубліка Узбекістан) былі сфарміраваныя тры групы ягнятак ва ўзросце 15-40 дзён (па 10 жывёл у кожнай групе). У склад першай групы былі ўключаны клінічна здаровыя ягняты, у склад другой групы – ягняты клінічна здаровыя, пасля праведзенага лячэння пры бранхіце і бронхапнеўманіі, у склад трэцяй – клінічна хворыя ягняты з сімптомамі рэспіраторнай паталогіі запаленчага характару (бранхіта і бронхапнеўманіі). Лячэбныя мерапрыемствы ў ягнят другой і трэцяй груп засноўваліся на курсавым ужыванні антыбактэрыйных і нестэроідных супрацьзапаленчых прэпаратаў. Групы фармаваліся па меры захворвання і акрыяння ягнятак. Крытэрыем іх акрыяння было знікненне клінічных прыкмет хвароб (як было прынята ў гаспадарцы).

Ва ўсіх ягнятак былі адабраныя ўзоры крыві, у якой падлікам у камеры Гараева вызначалі ўтрыманне эрытрацытаў і лейкацытаў, а геміглабінцыянідным метадам – канцэнтрацыю гемаглабіну.

На падставе праведзеных даследаванняў было зроблена заключэнне аб тэрапеўтычнай эфектыўнасці выкарыстаных лячэбных схем і неабходнасці пашырэння спектра комплексных лячэбных мерапрыемстваў.

Лічбавы матэрыял эксперыментаў апрацаваны статыстычна з выкарыстаннем праграмы Statistica 7.0 зыходзячы з узроўня значнасці 0,05. Пры статыстычнай апрацоўцы разлічвалі сярэднюю арыфметычную (X), стандартнае адхіленне (σ), дакладнасць адрозненняў паміж мноствамі дадзеных (р), ужываючы непараметрычны крытэрый Мана-Уітні.

**Вынікі даследванняў.** Было вызначана, што ўтрыманне ў крыві здаровых ягнятак эрытрацытаў, лейкацытаў і гемаглабіну знаходзілася ў межах нарматыўных значэнняў. У якасці такіх паказчыкаў былі прыняты наступныя значэнні: $12{,}0\text{-}18{,}0\times10^{12}$/л (для эрытрацытаў), $8{,}0\text{-}17{,}0\times10^{9}$/л (для лейкацытаў) і 90-135 г/л (для гемаглабіну) [5]. Пры гэтым узровень эрытрацытаў у крыві ягнятак і другой, і трэцяй груп быў статыстычна значна ніжэй (на 17,0 і 17,4%) адпаведна. Канцэнтрацыя гемаглабіну ў крыві здаровых жывёл таксама статыстычна значна перавышала яго ўзровень у крыві жывёл другой і трэцяй груп (на 13,5 і 18,5% адпаведна). Дадзеныя змены могуць характарызаваць недастатковую нармалізацыю функцыі чырвонага косткавага мозгу пасля перахворвання і ў працэсе развіцця рэспіраторных хвароб.

Узровень лейкацытаў у крыві ягнятак першай групы, наадварот, стаўся істотна ніжэйшым, чым у жывёл другой і трэцяй груп (на 18,6 і 35,8% адпаведна). Вызначаныя адрозненні таксама былі статыстычна значнымі. Выяўленне падобных зменаў можа паказваць на захаванне запаленчых змяненняў у арганізме ягнятак наогул і ў бронхалёгачнай

сістэме ў прыватнасці. І калі ў ягнятак трэцяй групы дадзеная тэндэнцыя заканамерная, то ўдругой групе яна характарызуе няпоўнае акрыянне жывёл пасля праведзенага лячэння, а таксама на яго магчымую нізкую тэрапеўтычную эфектыўнасць.

**Заключэнне.** Праведзеныя намі даследванні паказалі, што адсутнасць клінічных прыкмет у ягнятак пасля заканчэння правядзення лячэбных мерапрыемстваў пры рэспіраторных хваробах, не з'яўляецца крытэрыем іх поўнага акрыяння. Захаванне ў крыві жывёл зменаў, якія характарызуюць няпоўнае выкараненне запаленчых працэсаў і аднаўленне функцыянальнай актыўнасці чырвонага косткавага мозгу, паказвае на недастаткова высокую эфектыўнасць тэрапеўтычных мерапрыемстваў. Павышэнне іх эфектыўнасці можа заключацца ва ўключэнні ў схемы комплекснай тэрапіі пры рэспіраторных хваробах ягнятак лячэбных сродкаў, дазваляючых стымуляваць абменныя працэсы, павысіць імунную рэактыўнасць і натуральную рэзістэнтнасць у арганізме.

***Літаратура.*** *1. Pneumonic lesions in lambs in New Zealand: patterns of prevalence and effects on production / K.A. Goodwin, R. Jackson, C. Brown, P.R. Davies, R.S. Morris, N.R. Perkins // New Zealand Veterinary Journal. – 2004. – Vol. 52, №:4. – P. 175-179. 2. Treatment of bacterial respiratory infections in lambs / A.P. Politis, N.G.C. Vasileiou, K.S. Ioannidi, V.S. Mavrogianni // Small Ruminant Research. – 2019. – Vol. 176. – P. 70-75. 3. Oruc, E. The pathologic and bacteriologic comparison of pneumonia in lambs / E. Oruc // Turkish Journal of Veterinary and Animal Sciences. – 2006. – Vol. 30. – P. 593-599. 4. Lindström, L. Bronchopneumonia in Swedish lambs: a study of pathological changes and bacteriological agents / L. Lindström, F.A. Tauni, K. Vargmar // Acta Vet Scand. – 2018. – Vol. 60, 54. 5. Внутренние болезни животных. Выполнение и оформление курсовой работы : методические указания для студентов дневной и заочной формы получения образования по специальности «Ветеринарная медицина» / С. В. Петровский, В. Н. Иванов, М. В. Богомольцева, В. Н. Васькин ; Витебская государственная академия ветеринарной медицины, Кафедра внутренних незаразных болезней. – Витебск : ВГАВМ, 2024. – 55 с.*

УДК 619:616.379-008.64:636.7

**ПАНЬ ЧЭНЬ,** студент
Научный руководитель – **Гиско В.Н.,** канд. вет. наук, доцент
УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины», г. Витебск, Республика Беларусь

## ТЕРАПЕВТИЧЕСКИЕ ПОДХОДЫ ЛЕЧЕНИЯ ИНСУЛИНЗАВИСИМОГО САХАРНОГО ДИАБЕТА У СОБАК

**Введение.** Сахарный диабет у собак – одно из наиболее распространенных эндокринных заболеваний в ветеринарии. Заболевание чаще встречается у собак среднего и старшего возраста. Предрасполагающими факторами считаются ожирение, генетическая предрасположенность и пол [1, 2].

Задача научной работы состояла в экспериментальном обосновании эффективности применения в лечении инсулинозависимого сахарного диабета у собак свиным инсулином средней продолжительности действия Ленте-инсулин, 40 ЕД/мл.

**Материалы и методы исследований.** Для решения поставленной задачи в условиях клиники Zhi Ai города Вэйхай провинции Шаньдун КНР после постановки диагноза клиническими методами, биохимического исследования крови, общего анализа мочи, экспресс-теста на кетоновые тела в моче, собаке породы такса был поставлен диагноз «сахарный диабет». Задача опыта состояла в отработке оптимальной дозы препарата Ленте-инсулин для лечения инсулинозависимого сахарного диабета. Инсулин будет вводиться подкожно, режим дозирования будет корректироваться по результатам мониторинга глюкозы.

**Результаты исследований.** На первом этапе исследований провели клиническое